16 ЛІСТАПАДА 1999г. АЎТОРАК

НАВІНЫ

№113 (644) КОШТ СВАБОДНЫ

Шаноўны чытач!

У тваіх руках апошні выпуск НАВІНАЎ, які выходзіць у свет. Далей газета выходзіць не будзе. Крыўда на газету за «абразу годнасці і гонару», адзененая сакратаром Савета бяспекі РБ сп. Шэйманам у 10 мільярдаў рублёў і цалкам задаволеная судом, зрабіла з НАВІНАЎ банкрута. Рэдакцыя газеты ніколі не мела, не мае і не можа мець такой сумы — 10 000 000 000 рублёў. Гэта занадта вялікія грошы, каб незалежнай газеце было магчыма іх зарабіць і выплаціць сп. Шэйману. Іск у суд выканаў пастаўленую задачу — НАВІНЫ задушаны матэрыяльна.

З 1 снежня гэтага года пачнецца выпуск новай газеты — НАША СВАБОДА, забарона на выпуск якой адменена. Яна будзе пераемніцай тых традыцыяў, якія склаліся ў зачыненай СВАБОДЗЕ і забітых грашовым пакараннем НАВІНАХ.

наша СВАБОДА

НАША СВАБОДА — ВАША ГАЗЕТА!

АКЦЫЯ

Ланцуг Свабоды

Мікіта ПАЎЛАЎ

Прадстаўнікі БНФ, АГП і БСДП (Народная Грамада) падалі ў Мінгарвыканкам заяўку на правядзенне 24 лістапада з 15 да 19 гадзінаў у сталіцы буйнога пікету пад назвай «Ланцуг Свабоды».

Больш за 2.000 чалавек павінны стаць у непарыўны жывы ланцуг па абодвух баках праспекта Скарыны са свечкамі і ліхтарыкамі ў руках — ад плошчы Якуба Коласа да вуліцы Валгаградскай. Акцыя прымеркаваная да гадавіны рэферэндуму 1996 года, у выніку якога былі ўнесеныя змяненні ў дзеючую Канстытуцыю, прынятую ў 1994 годзе. Яна праводзіцца таксама напярэдадні планаванага падпісання саюзнага дагавора паміж Расіяй і Беларуссю.

Мэтамі акцыі, акрамя іншага, з'яўляюцца падтрымка намаганняў міжнароднай супольнасці па наладжванні перамоўнага працэсу.

Арганізатары ўпэўненыя, што мерапрыемства павінна быць дазволена, таксама як, напрыклад, была дазволена дэманстрацыя камуністаў 7 лістапада, з-за якой на працяглы час быў перакрыты рух на праспекце Скарыны ў цэнтры Мінска.

У гэты ж дзень у 11 гадзінаў ад цэнтральнай прахадной Мінскага аўтамабільнага завода стартуе Марш пратэсту працоўных, які пройдзе ў выглядзе шэсця да пасольстваў ЗША, Расіі, Германіі, Вялікабрытаніі, Італіі і Францыі. Паслам гэтых краінаў будзе ўручаная петыцыя аб парушэннях грамадзянскіх правоў у галіне дзейнасці прафсаюзаў. ■

СКАНДАЛ

Саммит в Стамбуле — продолжение диалога?

Егор ИВАНОВ

Десять представителей политической оппозиции поедут в составе белорусской делегации в Стамбул на заседание специальной рабочей группы ОБСЕ по Беларуси, которое пройдет 17-18 ноября.

Вот этот состав: ОГП — Станислав Богданкевич, БНФ — Юрий Беленький и Винцук Вячорка, БСДГ — Станислав Шушкевич, «Надзея» — Валентина Поликова, БПТ — Александр Бухвостов, ПКБ — Сергей Калякин, ЛДП — Сергей Гайдукевич. Верховный Совет в Стамбуле будет представлять Анатолий Лебедько.

Правительственную сторону в Стамбуле представят помощник Лукашенко Михаил Сазонов и замминистра иностранных дел Владимир Герасимович.

Как известно, на состав делегации от оппозиции в значительной степени повлиял глава группы ОБСЕ в Беларуси Ханс-Георг Вик. Именно он настоял на том, чтобы пропрезидентская ЛДП, известная «криминальными» скандалами, и чисто номинальная «Надзея» также назывались «оппозиционными» партиями.

В Турцию не едет заявленный ранее лидер БСДП (НГ) Николай Статкевич, на которого заведено уголовное дело за Марш Свободы. 9 ноября глава Ханс-Георг Вик получил письмо от Валерия Коренева — следователя по делу Статкевича. В письме отмечается, что участие Статкевича в выездном заседании рабочей группы по Беларуси Парламентской Ассамблеи ОБСЕ не возможно, так как именно на это время запланированы следственные мероприятия по его делу. В знак протеста БСДП (НГ) вообще отказалась направить в Стамбул своего представителя.

Кстати, накануне партию Николая Статкевича приняли во всемирную организацию Социнтерн, объединяющую ведущие социал-демократические партии мира — по одной от каждой страны. Поздравляем! ■

ВОКА ЗА ВОКА

Никто не забыт

«Слуги режима» — так называется проект неизвестных создателей, появившийся в сети Интернет в ноябре.

Никита ПАВЛОВ

Люди, которые представились как «Патриоты Беларуси», пишут:

«Любой диктатор бессилен претворять в жизнь свои замашки, если ему не помогают верные псы, готовые выполнить любой приказ.

Мы, патриоты Беларуси, начинаем создавать «черный список» тех, кто помогает колхозному диктатору Лукашенко держаться у власти. Все эти люди своими действиями совершают преступления. Никто из них не уйдет от расплаты. Настанет тот час, когда они ответят по закону за свои преступления.


Мы призываем всех, кто читает эти строки, присылать нам имена, фамилии, портреты, адреса тех людей, которые судят, арестовывают, избивают мирных демонстрантов. Все они будут занесены в наш «черный список».

На сайте можно найти портреты «верхушки» чиновников из администрации президента, правительства и милицейского начальства. Все они сопровождаются комментариями о том, в чем эти люди «провинились» перед белорусским народом. Не забыты и более «мелкие сошки» — судьи, выносившие приговоры участникам демонстраций, курсанты КГБ, хватающие людей на улицах, милиционеры и ОМОНовцы, издевающиеся над белорусами.

Адрес проекта неизвестных патриотов - http://meltingpot.fortunecity.com/kings/1092/ ■

Перелом

Если Лукашенко не договорится с политиками «новой волны», то следом придут молодые радикалы, которые чихать хотели на переговорные процессы и борьбу за десять минут телеэфира в неделю



Фота IREX/ProMedia

Николай ХАЛЕЗИН

Прошел месяц после того, как десятки тысяч белорусов вышли 17 октября на «Марш Свободы». Средства массовой информации то и дело возвращаются к этой акции, а большинство западных политиков изменили мнение о белорусской оппозиции, отмечая ее силу и единство. Что изменилось после ключевой акции осени?

Стамбульский синдром

После «Марша Свободы» белорусские власти как будто подменили. Создавая иллюзию демократических перемен, Лукашенко пошел на ряд мер, которые были призваны изменить мнение Запада о нынешнем белорусском режиме. Но это была лишь видимость.

После визита в Минск представителя ОБСЕ Адриана Северина и его беседы с Александром Лукашенко были отпущены на свободу организаторы и участники «Марша Свободы». Правда, они были отпущены лишь под подписку о невыезде, став заложниками власти накануне саммита ОБСЕ в Стамбуле, который пройдет 18-19 ноября. Теперь Лукашенко может шантажировать Запад тем, что вновь упечет за решетку Николая Статкевича, Валерия Щукина и других заявителей и участников октябрьской акции, если на саммите Запад проявит слабость.

После освобождения политзаключенных пришел черед «либерализации» в области СМИ. Власти любезно разрешили зарегистрировать ранее закрытые газеты. Сегодня демократия по-белорусски выглядит следующим образом: власти сажают ни за что граждан или закрывают без причин газеты, а затем надевают на себя маску благодетелей, выпуская на свободу политиков и разрешая издавать газеты. После этого министр иностранных дел Урал Латыпов или Александр Лукашенко рассказывают посланцам Запада о том, на какие «уступки» им приходится идти, чтобы переговорный процесс между властью и оппозицией продолжался.

На самом деле продолжение переговорного процесса Александру Лукашенко необходимо лишь из чувства самосохранения. Он до сих пор верит в то, что сможет, через создание иллюзии демократизации, получить кредиты и не утратить режим наибольшего благоприятствования в торговле с Западом.

Скорее всего, эти мечты окажутся тщетными. Для того, чтобы страны Евросоюза и США поверили в то, что Лукашенко встал на путь демократии, ему необходимо сделать очень многое из того, чему противится все его естество. Пока Запад не верит ни одному слову Александра Лукашенко. Об этом говорит тот факт, что на двусторонние встречи с Лукашенко во время саммита в Стамбуле согласились лишь Борис Ельцин и казахский лидер Нурсултан Назарбаев. Если так и произойдет, то эти встречи будут выглядеть весьма нелепо. Во-первых, и с одним, и с другим Лукашенко встречался совсем недавно. А во-вторых, о чем эти лидеры могут пообщаться в Стамбуле, о чем не пообщались в Москве и Астане?

Демократический кулак

Действия белорусской оппозиции как во время проведения «Марша Свободы», так и после акции достойны лестных эпитетов. Мужество Николая Статкевича, сделавшего со своей стороны все возможное, чтобы предотвратить столкновение, и выдержавшего в заключении 11-дневную голодовку; доблесть Валерия Щукина, спасшего от серьезных травм несколько милиционеров и в очередной раз прошедшего застенки белорусских тюрем; четкость позиции новых лидеров БНФ во главе с Винцуком Вячоркой, сумевших преодолеть кризис в своей политической структуре; стойкость Анатолия Лебедько, оказавшегося не только аппаратным политиком и грамотным «переговорщиком», но и политиком «уличной демократии».

Белорусские демсилы находятся сегодня в хорошей форме и способны, проводя согласованную и последовательную позицию, переломить существующую ситуацию в свою пользу. Нынешняя белорусская власть сегодня, в отличие от оппозиции, находится в состоянии, близком к краху. Ситуация в корне отличается от той, которая была еще два года назад: смятение в чиновничьих кругах, полное отсутствие средств у правительства, международная изоляция и не выдерживающие никакой критики шаги Лукашенко как во внутренней, так и во внешней политике.

Когда Александр Лукашенко, еще будучи легитимным президентом, говорил, что такую оппозицию, как в Беларуси, надо беречь и лелеять, он был в чем-то прав. На смену политикам, придерживающимся правил аппаратной игры, пришли политики, использующие самые современные политические технологии. На смену пособию по научному коммунизму пришел учебник «Основы маркетинга». Если Лукашенко попытается посадить и политиков «новой волны», то следом придут радикальные молодежные движения и группы, которые чихать хотели на переговорные процессы и борьбу за десять минут телеэфира в неделю. У них другие учебники — «Нелегалы» и «Гісторыя паўстанняў на Беларусі».

Сейчас власти с опаской ждут следующих акций оппозиции. В кругах чиновников говорят, что после «Марша Свободы» один из руководителей Мингорисполкома сказал: «в следующий раз их будет вдвое больше, и они будут с косами и вилами». С такой политикой, которую проводят белорусские власти, это будет не удивительно. ■

памяць XX стагоддзя 1905–1999

Вулічная сімволіка

Міхал МАТУШ

Па дзіўным збегу акалічнасцяў 17 кастрычніка 1999 г. шчыльныя па фронце і ў глыбіню міліцэйскія шэрагі з шчытамі і дубінкамі сустрэлі ўдзельнікаў «Маршу Свабоды» каля вуліцы імя Івана Пуліхава. Пуліхаў — гэта той малады чалавек, якога ў 1906 годзе пакаралі смерцю праз павешанне на варотах мінскай турмы (турма знаходзіцца на вул. Валадарскага).

Смяротны прыгавор тагачасны суд вынес яму за замах на мінскага генерал-губернатара Курлова, здзейснены на пл. Свабоды. А смяротны вырак Курлову вынесла арганізацыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Гэта генерал-губернатар 31 кастрычніка 1905 года аддаў загад страляць па мірным мітынгу мінскіх працоўных, якія патрабавалі дэмакратычных правоў і падмены самаўладдзя. Мітынг адбываўся на Прывакзальнай плошчы Мінска, сюды сышлося каля 20 тысяч чалавек, і вось іх пачалі расстрэльваць салдаты з трохлінеек і паліцыя з наганаў. 100 удзельнікаў мітынгу былі забітыя, 300 параненыя. Гэтае злачынства ўвайшло ў нашую гісторыю пад назвай Курлоўскага расстрэлу. Помніка ахвярам расстрэла на плошчы няма. Не паставілі яго ў савецкія часы, не маюць намеру ўшанаваць тую трагедыю і сённяшнія ўлады. Усе ўлады не надта паважаюць апазіцыйных пратэстантаў.


17 кастрычніка 1905 года царом быў выдадзены Маніфест аб стварэнні Думы і «дараванні» некаторых правоў («мёртвым — свабода, жывых — пад арэст»). Сярод абяцанак былі пазначаныя правы на сходы, шэсці і мітынгі. Курлоўскі расстрэл здарыўся праз 2 тыдні. Таго ж самага дня кастрычніка, але ў 1989 годзе ЦК КПБ упершыню прадэманстраваў савецкім беларусам міліцэйскія шчыты і дубіны на мітынгу каля Маскоўскіх могілак. Мноства людзей на ўласныя вочы пабачылі, што ўрад добра падрыхтаваўся да народных пратэстаў, разумеючы, што партыю ўлады і народ раздзяляе процьма. Тая ж процьма выразна адкрылася і 17 кастрычніка бягучага года каля вуліцы Пуліхава, дзе людзям прыйшлося абараняцца ад ахоўнікаў улады. ■

УСХОДНІ НАПРАМАК

Фарпост патрыятызму

Канстанцін СУРЫН

Некалькі дзён таму прэм'ер-міністр расійскага ўрада сп.Пуцін паведаміў мільёнам тэлегледачоў, што Расія, страціўшы савецкую ідэалогію, не стварыла новай і павінна запоўніць непажаданы вакуум. На думку Пуціна, дзяржаўнай ідэалогіяй Расіі мусіць быць «патрыятызм».



У святле паабяцанага на канец лістапада падпісання Саюзнай дамовы кіраўнікамі Расіі ды Беларусі і ўхвалення дакумента двухпалатнымі парламентамі абодвух дзяржаваў гэтакае бачанне ўплывовым прэм'ер-міністрам ідэалагічных даляглядаў немагчыма не заўважаць. Чачэнская вайна, дзе з расійскага боку ўсе, ад салдата да генералаў, як сведчаць іх тэлевыказванні, называюць Чачню «расійскай тэрыторыяй, на якой павінны дзйнічаць расійскія законы». Не федэральныя, а менавіта расійскія. Адпаведна меркаванням У.Пуціна, тут таксама будзе дзейнічаць «расійскі патрыятызм», у чым няма сумненняў, бачачы апрабаванне сучаснай тэхнікі на вёсках і нафтаскладах.

У выпадку з нашай «славянскай саюзнай дзяржавай» беларускі патрыятызм на фоне расійскага будзе выглядаць як шчыры нацыяналізм (пагрозлівы для канстытуцыйнай прасторы Саюза). Беларускае радыё безупынна гаворыць пра адраджэнне «Святой Русі» на беларускіх землях і шчасце братняга аб'яднання. Безумоўна, няма ніводнага чалавека, які б адмаўляў патрэбу эканамічнага саюза Беларусі і Расіі, але прыхільнікаў палітычнага саюза, здольных зразумець на што патрэбны наддзяржаўныя органы, новыя пасады, з кожным днём меншае на столькі, што ўжо скончаны размовы пра народныя рэферэндумы. Ва ўсялякім разе на Беларусі бальшыня народа не ўхваліць гэтую палітычную і ваенную унію. Да таго ж падпісанне дамовы паскорыць рух пад НАТАўскі парасон прыбалтыйскіх рэспублік.

Зразумела, што напярэдадні парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў расійскія палітыкі жадаюць бліскануць такой перамогай, як далучэнне Беларусі да Расіі без адзінага стрэлу. Але як у дваццатыя гады многія жадалі «савецкай улады без камуністаў», так цяпер у Маскве жадаюць прылучыць Беларусь, але без Лукашэнкі, якога яны проста баяцца. Як знойдуць кансэнсус — пабачым. Расавыя доказы (славянская агульнасць, песні, скокі, звычаі да застолля) не надта ўздзейнічаюць на свядомасць людзей, якім не хочацца зацішаць Паўночны Каўказ жыццямі сваіх дзяцей. Людзі памятаюць, як даўся ім у знакі савецкі патрыятызм, і наўрад ці прымуць ідэалогію расійскага патрыятызму, які нацэлены на адраджэнне Святой Русі, дзе Беларусь стане высунутым наперад фарпостам. ■

ПАРТЫІ

Союзный договор — угроза Европе

Олег БЕБЕНИН

Координационная Рада демократических сил Беларуси обратилась к главам государств-участников саммита ОБСЕ в Стамбуле с просьбой принять меры, чтобы устранить угрозу безопасности в Европе, которую несет возможное уничтожение независимости нашей страны в результате действий антидемократического режима Лукашенко и властей Российской Федерации.

«В Беларуси уничтожены демократические институты власти, и наш народ не имеет возможности демократическим путем решать свою судьбу, — говорится в заявлении, принятом на заседании Рады 10 ноября. — В то же время массовые акции протеста и данные независимых социологов показывают: абсолютное большинство граждан Беларуси выступает за независимость своей страны».

Координационная Рада была создана зимой по решению Конгресса демократических сил. В нее вошли три крупнейших демократических партии, а также Ассамблея негосударственных организаций, Конгресс демократических профсоюзов и гражданская инициатива Хартия'97. На прошедшем заседании КРДС впервые в качестве полноправного члена участвовал также Белорусский Народный Фронт, который после смены руководства «разморозил» свой статус наблюдателя в Раде. ■

СУДОВЫ ПРАЦЭС

Суд за гной для А.Р.

Іван БАБІЧАЎ

Суд над вядомым беларускім мастаком Алесем Пушкіным павінен прайсці 24 лістапада ў судзе Ленінскага раёна Мінска. Справу будзе разглядаць суддзя Сяргей Хрыпач, адвакатам мастака выступіць Ларыса Атаманчук, грамадскім абаронцам — прадстаўнік праваабарончага цэнтра «Вясна-96» Барыс Гюнтэр. Пушкін абвінавачваецца паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэкса РБ — 201, ч.2 (хуліганства з выключным цынізмам) і 86.2 (здзек над дзяржаўнымі сімваламі).

Нагадаем, што 21 ліпеня 1999 года, у дзень, калі, згодна з Канстытуцыяй 1994 года, скончыліся прэзідэнцкія паўнамоцтвы А.Р.Лукашэнкі, мастак правёў індывідуальную акцыю пратэсту: ён падвёз да будынка адміністрацыі кіраўніка беларускай дзяржавы цялежку з гноем, на якім ляжалі дзяржаўныя сцяг і герб, а таксама партрэт першага прэзідэнта Беларусі і плакат з надпісам «За пяцігадовую плённую працу». Пушкін быў затрыманы міліцыяй. Сам Алесь Пушкін адмаўляе ў сваіх дзеяннях хуліганства. Паводле ягоных словаў, гэта была «мастацкая акцыя», якой ён выказаў сваё стаўленне да сітуацыі ў Беларусі. ■

ЗАМЕЖЖА

Гарольд Хонгжу Коу: «Приход истинной демократии в Беларусь — только вопрос времени»

Выдержки из выступления г-на Гарольда Хонгжу Коу, секретаря Государственного департамента США по вопросам демократии, прав человека и труда, во время недавнего пребывания в Минске на правозащитной конференции.



Фота Ул.ШЛАПАКА

...Мой покойный отец, Кванг Лим Коу, был юристом и активистом демократического движения. В течение некоторого времени он представлял Южную Корею на дипломатическом поприще, пока демократическое правление там не было свергнуто в результате военного переворота, и он был вынужден уехать в Соединенные Штаты, где я и вырос. Именно за столом, за которым собиралась наша семья, слушая родителей и их друзей, я впервые узнал о корейской и американской политике, о демократии и международных отношениях. Именно в кругу семьи я впервые услышал и научился уважать наиболее близкие моим родителям ценности: права человека, уважение свободы других людей, демократическое принятие решений и главенство закона.

...К сожалению, эти разделяемые многими всеобщие ценности продолжают быть оспариваемы. Слишком многие правительства продолжают отказывать своим гражданам в праве на выбор власти. Руководители стран говорят о демократии, одновременно фальсифицируя выборы, затыкая рты своим оппонентам и зажимая прессу. Такие действия не приемлемы для сегодняшней Европы. Соединенные Штаты глубоко озабочены ситуацией в Беларуси. В отношении этой страны мы установили политику «избирательных контактов», ограничив число и уровень официальных контактов, одновременно сохраняя и развивая наши отношения с демократическими силами, независимыми СМИ и неправительственными организациями. Мы прекратили предоставление любой помощи правительству, за исключением гуманитарной помощи учреждениям здравоохранения и образования.

...Возвращение посла Спекхарда не означает нормализации отношений между нашими странами. Отношения не могут быть и не будут нормализованы, пока правительство Беларуси не предпримет конкретные шаги для установления демократических норм, соблюдения прав человека и главенство закона. О каких шагах мы говорим? Как эта страна может продемонстрировать свою «демократичность»? Я назову здесь четыре основные составляющие: свободу волеизъявления людей, гражданское общество, главенство закона и информированность граждан.

...Как недавно отметила мой шеф, Государственный секретарь США Мадлен Олбрайт, «демократия должна вырасти из желания людей участвовать в принятии решений, которые будут определять в дальнейшем их жизнь... В отличие от диктатуры демократия никогда не может быть навязана — она всегда самостоятельный выбор». В Беларуси режим стремится подавить демократию. Им были использованы неконституционные методы для изменения конституции страны, а впоследствии и переделанная конституция для подрыва и замены легитимных демократических институтов. Легитимность может быть восстановлена только путем свободных и справедливых демократических выборов, в которых должно быть обеспечено участие всех на равной основе, и восстановлением необходимого механизма сдерживания и уравновешивания ветвей власти.

...В Беларуси те из вас, кто решили говорить властям правду, рискуют своей свободой и даже жизнью. Бывший премьер-министр Михаил Чигирь, депутаты Верховного Совета 13-го созыва Анатолий Лебедько и Валерий Щукин, лидер Социал-демократической партии Николай Статкевич — вот лишь некоторые из большого числа оппозиционных политиков, которые подверглись тюремному заключению за мирное выражение своих политических убеждений. Многие задерживались на долгий срок без предъявления каких-либо обвинений. Другие, как Виктор Гончар, Юрий Красовский, генерал Юрий Захаренко, Тамара Винникова, исчезли. Некоторые, как Семен Шарецкий и Зенон Пазьняк, выехали за границу, опасаясь за свою безопасность. Вместе взятые, эти аресты, исчезновения и бегства значительно сгустили атмосферу страха, существующую в Беларуси, и дали понять, что граждане, возражающие властям, находятся под серьезной угрозой. Соединенные Штаты, а также Европейский Союз и ОБСЕ призывают белорусское руководство освободить тех, кто был задержан за использование своего права на свободу выражения, и соблюдать международные признанные права человека и основные свободы, включая свободу выражения.

...Я позвонил отцу из Кореи и спросил его, как же так получается, что Соединенные Штаты, самая мощная держава в мире, могут осуществлять смену правительства без участия военных, а Корея, гораздо меньшая страна, никак не может избежать правления военных. Отец ответил: «Ты видишь, что означает настоящая демократия. В стране, где главенствует закон, если ты президент, войска подчиняются тебе. В других странах, если тебе подчиняются войска, ты президент».

...В Беларуси режим борется с критиками, налагая ограничения на СМИ. Даже доступ в Интернет ограничен провайдерами государственной формы собственности. Эти меры не остановили усилий таких журналистов, как Павел Жук и Павел Шеремет, которые, чтобы сказать правду, подвергли себя угрозе преследований, запрету на передвижение, отмену аккредитации и даже тюремное заключение. Неудивительно, что американская неправительственная организация Комитет защиты журналистов в течение трех лет подряд относила белорусский режим к числу десяти злейших врагов прессы.

...Когда историки будущего будут писать о конце двадцатого столетия, они отнесут развитие демократии — от 30 стран в 1974 г. до 119 в наши дни — к нашим величайшим достижениям, а сохранение демократии — к нашим сложнейшим задачам. Это подлинно мировая революция, охватившая весь мир. Я верю, что приход истинной демократии в Беларусь — только вопрос времени. ■

© НАВІНЫ. Спасылка на газету НАВІНЫ абавязковая. Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, публікаваць артыкулы дзеля палемікі. Адрас: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 996
Выдаецца з 16 студзеня 1998 г. В.а. галоўнага рэдактара і заснавальнік Павел Жук. Выдавец — рэдакцыя газеты НАВІНЫ. Адрас для карэспандэнцыі: 220034, г. Мінск, вул. З.Бядулі, 6-47. Тэл./факс: 236-89-40.
E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by Друкарня Чэхаўскага паліграфкамбіната (Падольскі філіял), г.Падольск, вул.Кірава, 25 Заказ 613 Нумар падпісаны ў друк 15/11/99 (15:00) Наклад — 100.000